*Борсук Л.І.*

# ПОГЛЯДЫ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ ў КАНТЭКСЦЕ ЭСТЭТЫКІ АДРАДЖЭННЯ

Беларускае Адраджэнне, уключанае ў агульнаеўрапейскі культурна-гістарычны з працэс, не было перыферыйнай з'явай, хаця і пачалося пазней, чым еўрапейскае. Яго рэгіянальная адметнасць адзначаецца спецыфічнымі сацыяльна-эканамічнымі, дзяржаўна-палітычнымі і культурна-мастацкімі асаблівасцямі развіцця: адкрытасцю культурна-гістарычнай прасторы, спалучэннем дасягненняў усходнеславянскага рэлігійнага асветніцтва з ідэямі свецкага заходнееўрапейскага Адраджэння, значна менш моцным пафасам адмаўлення сярэдневякоўя.

Вядома, што самымі агульнымі рысамі беларускага Адраджэння XVI ст. былі яго дэмакратызацыя, сцвярджэнне ідэалаў гуманізму: чалавечнасці, мудрасці, веры ў чалавека, свабоды волі і ўчынку, пашана да закону як абагульнення мудрасці гістарычнага вопыту чалавецтва і мясцовага звычаю, прававой традыцыі. Яго найвялікшае дасягненне – абуджэнне нацыянальнай самасвядомасці, пачуцця патрыятызму, адкрыцця універсальнай формулы патрыятызму як любові чалавека да зямлі, на якой нарадзіўся, да зямлі як Радзімы, да Радзімы як дзяржавы, да мовы і звычаяў продкаў, з якімі "Бог прывёў і пусціў у свет" (нар).

Калі еўрапейскае Адраджэнне разглядаецца як эпоха, у якой самапазнанне чалавека адбывалася праз мастацтва (у ім абагаўлялася чалавечае і на зямлю апускалася боскае), то ў Беларусі не толькі мастацкія, а ў большай ступені сацыяльныя матывы былі культуратворчымі. Пры гэтым, эстэтычнае афармлялася ў супольнасці з рэлігійнасцю, паспалітасцю, шляхетнасцю, гераічнасцю, і гэтыя сацыяльныя катэгорыі выкрышталіся ва ўмовах лёсатворчых векапомных гістарычных падзей, звязаных са збіральніцтвам земель у Вялікім Княстве Літоўскім, ва ўмовах узмацнення шляхты-рыцарства, станаўлення талерантных адносін да рэлігій, узыходжання феадалізму, для якога век Адраджэння і Рэфармацыі стаў залатым векам, вяршыняй у яго развіцці.

Адметнасць беларускага Адраджэння была адной з граняў еўрапейскага, у скарбніцу якога арганічна ўвайшлі і надрукаваная Францыскам Скарынай Біблія, і рацыяналістычная філасофская думка Сымона Буднага, і Статут Льва Сапегі, і Граматыка Мялеція Смятрыцкага, і гераічны эпас Яна Вісліцкага, Міколы Гусоўскага, Андрэя Рымшы, аднолькава як і багатая музычная кантавая культура, эстэтычна звязаная вытокамі сваімі з дэмакратычнай пратэстанцкай еўрапейскай культурай.

Вядома, што сам тэрмін “адраджэнне” ўведзены італьянскім мастаком і гісторыкам мастацтва Джорджо Вазары. У XIV ст. ён быў першым, хто адчуў спецыфіку новых веянняў і патрабавання новых ідэалаў у мастацтве.

Адраджэнне, еўрапейскі Рэнесанс – гэта эвалюцыя мыслення, пераацэнка каштоўнасцяў, паняццяў шчасця, свабоды, Бога, правоў і абавязкаў, самога чалавека, яго месца ў прыродзе і сусвеце. Пошукі ідэалу былі скіраваны ў напрамку адраджэння антычнай культуры, антычнага ладу жыцця, спосабу мыслення і пачуццёвасці. Але ідэал не можа быць рэальнасцю эпохі, ён можа быць духоўным выпраменьваннем, вялікай марай, недасягальнай вяршынай, а жыццё трэба маляваць фарбамі, якія выпрацаваны і адпавядаюць новым патрабаванням часу. Новыя рэаліі эпохі дыктавалі пераключэнне акцэнту з тэацэнтрычнай канцэпцыі, характэрнай для Сярэднявечча, на канцэпцыю антрапацэнтрызму, пры якім сам Боскі пачатак не адмаўляўся, але гуманізм вёў да роўналегласці з Богам, да новай трактоўкі чалавечай годнасці, уздымаючы чалавека як творцу. Не толькі ідэі, але і творчая практыка людзей, спосаб іх жыцця вынікалі са своеасаблівага светапогляднага спалучэння пантэізму, неаплатанізму і індывідуалізму пры імкненні сцвярджаць роўнасць і раўназначнасць чалавека і Бога, чалавека і прыроды, а таксама чалавека і грамадства, чалавека і дзяржавы.

Еўрапейская рэнесансная канцэпцыя чалавека адлюстравана ў трактаце Піка дэла Мірандолы (1463–1494) “Аб годнасці чалавека”. У гэтым праграмным для эстэтыкі Адраджэння трактаце чалавек-творца ўзвышаецца як трыумф актыўнасці і тытанізму. Чалавек-мастак становіцца сімвалам эпохі, а мастацтва Рэнесансу, накіраванае на чалавека, здолела ў мастацкай форме ўвасобіць ідэал цэласнай гарманічнай асобы. Галоўныя эстэтычныя ідэі выпрацоўваліся самымі майстрамі мастацтваў у кантэксце тэорыі мастацтваў. У межах гэтай “эстэтыкі знізу” часцей называюць “Дзесяць кніг аб дойлідстве” Леона Бацісты Альберці (1404–1472), “Кнігу аб жывапісу” Леанарда да Вінчы (1452–1519) і “Устанаўленне гармоніі” Джазэфа Царліна (1517–1590).

Прыгажосць, гармонія, прапарцыянальнасць, вытанчанасць – галоўныя праблемы, на вырашэнне якіх быў скіраваны ўвесь пафас мастацтва гуманістаў, бо, як сцвярджаў адзін з эстэтыкаў гэтай эпохі Ляон Баціста Альберці, у чалавеку закладзена невынішчальнае памкненне да сузірання прыгажосці, калі “вочы прагнуць прыгажосці і гармоніі, і ў пошуку іх яны асабліва ўпартыя і асабліва настойлівыя” [1,с.86].

Еўрапейскі Рэнесанс не прапанаваў новых катэгорый і працягваў карыстацца ўжо распрацаваным паняццем гармоніі як меры, прапорцыі,

кампазіцыі. Але новы падыход да разумення гармоніі сусвету вызначыў і новы сэнс гэтага паняцця ў эстэтыцы.

Новае яе разуменне ў музыцы, напрыклад, было звязана з перамогай "вертыкалі над гарызанталлю". Тым самым тэарэтыкі зафіксавалі зрухі, звязаныя з секулярызацыяй духоўнага жыцця, што праявіліся найперш у еўрапейскай музычнай практыцы. Царліна быў першым сярод музычных гуманістаў, хто тэарэтычна сфармуляваў новую навуку аб гармоніі.

Секулярызацыя музычнай тэорыі і практыкі, функцыя новай танальнай гармоніі, паварот да грэчаскай філасофіі музыкі і свядомы адказ ад сярэдневяковай тэорыі кантрапункту – усе гэтыя патрабаванні часу адлюстравала музычная практыка. Еўрапейскі музычны Рэнесанс не пакінуў цэласнага мастацкага стылю. У той жа час ён прынёс у музыку светлае жыццесцвярджальнае мастацтва: высокае клавірнае, лютневае, віёльнае выканальніцтва. З народнага асяроддзя ў прафесіянальную музыку прыходзіць скрыпка з яе моцным пявучым гукам; атрымліваюць развіццё ансамблевая інструментальная музыка (музыцыраванне: нехта іграе на флейце, нехта на лютні ці віёле, двое спяваюць – любімы сюжэт рэнесансных карцін) і новыя формы вакальнай музыкі: канцанета, мадрыгал. Вынікам усяго музычнага развіцця эпохі Адраджэння было з'яўленне такога жанру, як опера, якая набыла росквіт ужо ў іншую гістарычную эпоху.

Пры агульнай секулярызацыі мастацкага працэсу новыя ідэі, аднак, прабівалі сабе дарогу не без цяжкасцяў, бо былі яшчэ даволі моцнымі традыцыі Сярэднявечча, і ў першую чаргу – рэлігійна-эстэтычнае разуменне мастацтва. Асабліва характэрна гэта было для Беларусі, дзе новыя ідэі "з'явіліся са спазненнем, праявіліся не так інтэнсіўна і ў даволі незвычайных і супярэчлівых формах" [2, №7, с.3]. Калі Адраджэнне ў Еўропе ўспрымалася як вельмі моцны рэвалюцыйны рух, то ў Беларусі новы светапогляд не адмаўляў, а вынікаў з сярэдневяковай тэацэнтрычнасці. Адметный рысай беларускага Адраджэння лічыцца яго арыентаванасць не на свецкую навуку і антычную культуру, а на Біблію, адсюль ***"хрысціянскі гуманізм***" як вынік спалучэння рэнесансна-гуманістычных адносін да чалавека, ідэй патрыятызму, служэння агульнаму дабру з хрысціянскім евангельскім вучэннем. Прадстаўнікі хрысціянскага гуманізму Ф.Скарына, М.Гусоўскі, М.Літвін, С.Будны, В.Цяпінскі, А. Волан, Л.Зізаній, С.Полацкі спрабавалі узгадніць і ў тэарэтычнай, і ў практычнай дзейнасці маральную канцэпцыю хрысціянства з філасофска-этычнымі ідэямі антычнасці, Адраджэння і Рэфармацыі. І разам з гэтай канцэпцыяй арыентацыя на безрэлігійны характар маральнай свядомасці чалавека стварыла атэістычную лінію ў

айчыннай гуманістычнай філасофіі, прадстаўленую імёнамі С. Лована, К. Бекеша, К. Лышчынскага.

Спалучэнне супрацьлеглых ідэйна-філасофскіх плыняў ўздейнічала такім чынам, што беларускае Адраджэнне, у параўнанні з італьянскім, не мела класічнай перыядызацыі з яго падраздзяленнем на гуманістычны (антрапалагічны), неаплатонаўскі і натурфіласофскі этапы. Беларускае Адраджэнне ў сваіх гістарычных абставінах убірала ў сябе ідэі ўсіх трох этапаў і мела свае плыні. Першая была звязаны з ідэямі хрысціянскага гуманізма, другая – з рэфармацыйным рухам, трэцяя (пасля 1596г.) адлюстравала палемічны стан светапогляду, ідэалогіі і культуры ў моцна палярызаваным канфесійным полі.

І ў першым, і ў другім выпадках ***адраджэнскі антрапацэнтрызм*** вылучаў на першы план праблемы зямнога прызначэння чалавека, яго здольнасці дасягнуць ідэалу пры дапамозе індывідуальных намаганняў, яго права на пазнанне і творчасць, але толькі тады, калі гэтыя намаганні чалавека суадносіліся з ідэяй агульнага дабра. Эстэтычнае ўзалежнівалася, такім чынам, ад этычнага, ад таго маральнага імператыву, згодна з якім грамадскія інтарэсы заўсёды ставілся вышэй за асабістыя і будаваліся на ідэйным кампрамісе дабрачыннасці, прыгажосці і ісціны. Між тым толькі хрысціянскі гуманізм падложжам гэтага адзінства выстаўляў біблейскае сумленне і ад яго выбудоўваў іерархію жыццёвых каштоўнасцей: любоў, веру, годнасць. Ярка вызначаны духоўны пачатак каштоўнасцей з'яўляўся, такім чынам, галоўным для выхавання і ўдасканалення чалавека-грамадзяніна і чалавека-патрыёта ў вырашэнні праблемы суадносін чалавека і грамадства. У імкненні аб'яднаць асобу і грамадства – вялікая заслуга беларускай рэнесансавай культуры і яе пачынальніка Францыска Скарыны.

XVI стагоддзе, як ***кульмінацыйнае ўзвышша беларускай культуры***, час росквіту рэнесансу і гуманізму беларускага Адраджэння, было названа "залатым векам", і ў першую чаргу, за багацце духоўнае, багацце творчай думкі, заснаванай на ідэях асветніцтва, высокага патрыятызму, служэння агульнаму дабру, за багацце творчасці ў жыцці і мастацтве. Так назваў гэты час Мікола Гусоўскі, які, як і ўсе выдатныя дзеячы той слаўнай эпохі,

"Перад багаццем і шчасцем зямным пастаянна
Ставіў багацце духоўнае – злата дзяржавы".

Між тым, беларуская літаратура, філасофская і эстэтычная думка, мастацтва мелі бясспрэчную далучанасць да рэнесанснага тыпу культуры(2, №7,с.5). Адкрыццё кнігадрукарства садзейнічала развіццю навукі і адукацыі, літаратуры і мастацтва, іх дэмакратызацыі. У XVI ст. у Вільні, Нясвіжы, Бярэсці, Лоску, Любчы, Цяпіне, Вянгрове дзейнічалі тыпаграфіі, вакол якіх

ствараліся цэлыя літаратурныя школы. Лінгвістыка, гісторыя, геаграфія, астраномія, матэматыка і медыцына дасягнулі вельмі вялікага ўзроўню, а юрыдычная думка лічылася самай распрацаванай у Еўропе, пра што красамоўна гаворыць змест Статутаў 1529, 1566, 1588 гг. У гэтым жа стагоддзі ўзводзяцца жамчужыны беларускай архітэктуры: Троіцкі касцёл у Ішкаладзі; Святадухаўская царква ў Кадэні; Барысаглебская царква ў Навагрудку; фарны касцёл у Гародні; цытадэлі - бажніцы ў Супраслі, Сынкавічах; рэфармацкія зборы ў Смаргоні, Заслаўлі, Асташыне; замкі ў Міры, Нясвіжы, Навагрудку. Мастацтва ўзнімаецца вельмі высока ў сваім развіцці. Узнікаюць першыя прафесійныя тэатры, набываюць развіццё музычнае і выяўленчае мастацтвы, з'яўляецца свецкі партрэтны жывапіс, удасканальваецца іканапіс, скульптура, дэкаратыўна-прыкладное і гравёрнае мастацтва.

Усяму гэтаму садзейнічала адамкнутасць граніц і адкрытасць культурна-гістарычнай прасторы. Было з чаго выбіраць, засвойваць ці адмаўляць. Патрабавалася развітае эстэтычнае пачуццё, каб нараджаліся новыя каштоўнасці з ярка вызначанымі ментальнымі якасцямі, прага творчасці ў жыцці і мастацтве, сапраўды мастакоўскае адчуванне свету. І яно ўжо было падрыхтавана традыцыйным адчуваннем прыгожага і хрысціянскай духоўнасцю, спалучэннем эстэтычных і этычных прынцыпаў, выхаваннем мудрасці, міласэрнасці, талерантнасці, прыгажосці, якія ішлі з Сярэднявечча. З гэтага ментальнага універсума паўставалі філасофская і навуковая думка, літаратура і мастацтва Адраджэння. Яны былі адкрыццём для свайго часу з характэрным універсальным рэнесансным сінтэзам зямнога і боскага, спалучэннем рэлігійна-трансцэндэнтнага са свецкімі (іманентнымі) каштоўнасцямі, з апорай, як любое адкрыццё, на ***ідэал прыгожага, добрага, вечнага.*** Першая, скарынінская плынь беларускага рэнесанснага гуманізму была арганічнай у аб'яднанні "веры і ведаў, навукі і мастацтва, народа і дзяржавы, асобы і грамадства" [2, №7,с.6].

Сацыяльнай базай беларускага рэнесанснага асветніцтва быў горад. У ім вызначалася эліта і гарадское паспольства, якія прызнавалі веды і духоўныя каштоўнасці за першасныя. У пошуку гармоніі духоўнага і цялеснага этычныя ідэалы спалучаліся з эстэтычнымі. Лічылася, што ўсе праявы прыроды і жыцця могуць служыць і павінны быць крыніцаю асалоды. Ні прырода, ні чалавек не грахоўная. Грэх – у зле, ад парушэння маралі, ад недасканаласці. Адсюль вучыцельскі, дыдактычны напрамак рэнесанснага гуманізму і асветніцтва як найвышэйшы пафас духоўнасці. Навучыць прыгожаму, мудраму, светламу не дзеля карысці, ці карыснасці, а дзеля агульнага дабра.

І Кракаў, і пазней Падуя, дзе Скарына атрымаў ступень “доктара свабодных мастацтваў”, падрыхтавалі глебу для наступнай асветніцкай дзейнасці вучонага па многіх напрамках чалавечай дзейнасці. Так, у ***Прадмове да Псалтыра*** Скарына разглядае гэтую кнігу як галоўную ў эстэтычных адносінах, найбольш блізкую да паэзіі, мастацтва, музыкі. Скарына ўзносіць хвалу псалму, Псалтыру, а разам з тым і самой музыцы, разумеючы яе вялікае значэнне для паяднання нябеснага і зямнога ў жыцці чалавека. Ён разважае: “І что ест, чего в псалмах не найдёшь? Нест лі там вълічества божия и хвалы его? Там ест справедливость. Там ест чистота душевная и телесная. Там ест наука всякое правды. Там мудрость и розум досконалый… Вси тыя речи, яко у великом сокровици в сей Малой Псалтыри найдёшь” [3,с.17–18].

Распачаўшы справу беларускага кнігадрукарства, Францыск Скарына, як і гуманісты Італіі, бачыў у ведах шлях “узвысіць паніжанага”, “каб мудрасць чалавечая на лице явилася”. Яго гуманістычная канцэпцыя, аднак, не несла касмапалітычнасці Сярэднявечча, удасканаленне чалавека ён бачыў не толькі ва ўмацаванні боскага, але і яго зямнога прадвызначэння, у любові да сваей зямлі – зямлі як Айчыны, Айчыны як дзяржавы. Гэта была своеасаблівая формула патрыятызму, з яе пачыналася ўзвышэнне нацыянальнай самасвядомасці, беларускага паспольства, пра гераічны стан якога ўжо праспяваў ў сваёй “Песні пра зубра” беларускі паэт-гуманіст і асветнік Мікола Гусоўскі.

У ***прадмове да Біблії*** Скарына, падкрэсліваючы значнасць сямі свабодных навук, пра якія ідзе гаворка на старонках прадмовы, ён акцэнтуе неабходнасць музычнага выхавання ў сістэме адукацыі: “Восхощет ли пак учится музыки, то ест певници, премножество стихов и песней светых по всей книзе знайдеши” [3,с.46].Скарына разглядае і пытанне аб агульных функцыях музычнага мастацтва, прычым у адрозненне ад айцоў царквы, якія лічылі, што музыка – гэта салодкая абалонка для больш глыбокага ўспрымання маральна-этычных запаветаў Святога пісання, ён, як чалавек свайго часу, падкрэслівае самастойнае рознабаковае значэнне музыкі, але ў межах яе маральнага ўздзеяння. Ён піша: „…Псалмы, яко бы сокровище всих драгих скарбов, всякие немощи, духовные и телесные уздравлють, душу и смыслы освещають, гнев и ярость усмирякость, мир и покой чинять, смуток и печаль отгоняють, чювствие в молитвах дають, людей в приязнь зводять, ласку и милость укрепляють, бесы изгоняють, ангелы на помощь призывають”[3,с.17]. Гэтыя разважанні маглі грунтавацца на народных павер’ях, у якіх спяванню, музыцы надаваліся гаючыя якасці. Яны сведчылі таксама аб адукаванасці аўтара. Ён мог ведаць трактат музычнага тэарэтыка

І.Цынкторыса “Абагульненне аб уздзеянні музыкі”, у якім сістэматызуюцца думкі антычных і сярэдневяковых аўтараў і пералічваецца дваццаць пунктаў уплыву музыкі на чалавека, сярод якіх узгадваецца аб тым, што “музыка праганяе смутак, змягчае жорсткасць, выганяе д’ябла, вылечвае хворых, цешыць людзей, выклікае любоў” і г.д. [4,с.364].

У яго спадчыне адлюстравана музычна-эстэтычная ідэя, характэрная для музычнай тэорыі позняга сярэднявечча, калі ў рамках дактрыны аб этычным прызначэнні музыкі (мадыфікацыя антычнага вучэння аб музычным этасе) меў месца і эстэтычны, пачуццёвы элемент, а ў спробе аб'яднаць веру і пачуцці, мараль і асалоду вызначаўся ачышчальны, катарсічны пачатак.

Таленавіты і адукаваны чалавек, гуманіст-асветнік, вучоны-энцыклапедыст, Ф.Скарына не мог не ўзняць тых праблем, што паўсталі ў сувязі з новай гуманістычнай філасофіяй і эстэтыкай. Ён пацвердзіў вельмі спецыфічную для развіцця ўсёй нашай культуры асаблівасць, якая ўяўляе сабой пэўны сінтэз дасягненняў усходнеславянскага рэлігійнага асветніцтва з ідэямі свецкага заходнееўрапейскага Адраджэння.

Святло Скарынавых ідэй дае магчымасць адчуць тую духоўную сілу, асэнсаваць глыбіню перажывання пачуццёвай выразнасці, якія былі дамінуючымі для нашых продкаў і праявілі сябе ў творах мастацтва сапраўды мастакоўскім адчуваннем прыгожага. З прагі духоўнасці, з жадання асэнсаваць Бога і сусвет і цераз яго – прыроду, красу, дабро, ласку – узнікала (на вяршыні аб’яднання душы і зямлі) песня селяніна і песня гусляра, песня-абрад і песня–малітва. Яе “генныя” вобразна-сюжэтныя, вобразна-эмацыянальныя і тэматычныя элементы склалі комплекс “этнічных пераваг” сучаснай беларускай мастацкай творчасці, яны сталі ўвасабленнем этнадыференцыйных яе характарыстык на свядомасным, эмацыянальным і мастацкім узроўнях – узроўнях нацыянальнага кантэксту[5].

Літаратура:

1. Альберти, Л.Б. Десять книг о зодчестве: В 2 т. – М.: Изд-во всесоюз.Академ. архит-ры. – Т 1: 1935. – 391 с.: ил.; Т.2: 1937– 791 с.:ил.
2. Конан, У. Мастацкая культура Беларусі эпохі Рэнесансу /Мастацтва. – 2000. – №7–12.
3. Скарына, Ф. Творы: Прадмовы, казаньні, пасьляслоўі, акафісты, пасхаліі. (Уступ. арт., падр. тэкстаў, камент.,слоўн. А.Ф. Коршунава) – Мн.: Навука і тэхніка, 1990. – 206 с.: іл.
4. Музыкальная эстетика западноевропейского средневековья и Возрождения. – М.: Музыка, 1971. – 687 с.
5. Борсук, Л.І. Музычная эстэтыка Беларусі XI-XVII стагоддзяў /Л.І. Борсук – Брэст: Альтернатива, 2012. – 200 с.